УДК 745.522(476.2-21)“19”

# Дэкаратыўнае рашэнне даматканых вырабаў у XX ст. у в. Васільеўка Добрушскага раёна

***Рассыльная В.Ю.***
*Установа адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, Мінск*

*Артыкул прысвечаны раскрыццю дэкаратыўных асаблівасцей даматканых вырабаў з вёскі Васільеўка Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў XX стагоддзі. Гэта вёска адносіцца да этнакультурнага рэгіёна Падняпроўе, багатага на разнастайныя ткацкія традыцыі. Даследаванне засяроджана на мастацкіх характарыстыках даматканых вырабаў з аўтарскай сямейнай калекцыі, якая ўключае розныя тыпы тканых вырабаў: ручнікі-набожнікі, уціральнікі, абрусы і посцілкі, створаныя ў перыяд з пачатку XX стагоддзя да 1960-х гадоў. Выяўляецца лакальная спецыфіка вырабаў: ромба-геаметрычная арнаментыка, рытмічнае чаргаванне палос і перавага чырвона-бела-чорнай каляровай гамы. Адмысловая ўвага нададзена тэхналагічным аспектам: выкарыстанню льняных і баваўняных ніток, спалучэнню розных перапляценняў (палатнянага, саржавага, двухуточнага шматрамізнага, бранага, выбарнага і пераборнага), адзначана ўтылітарнае і абрадавае прызначэнне вырабаў. Такім чынам, даследаванне дэманструе багацце і ўнікальнасць ткацкіх традыцый в. Васільеўка Добрушскага раёна, якія, нягледзячы на ўсе гістарычныя выпрабаванні мінулага стагоддзя, захавалі сваю мастацкую і культурную каштоўнасць; робіць унёсак у вывучэнне лакальных варыяцый беларускага тэкстылю, падкрэсліваючы яго ролю ў этнакультурнай спадчыне Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *беларускае традыцыйнае ткацтва, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, народныя промыслы, ручнік-набожнік, Добрушскі раён, Падняпроўе.*

*(Искусство и культура. — 2026. — № 1(61). — С. 12–17)*

# Decorative Solution of the 20th Century Homespun Products in the Village of Vasilyevka, Dobrush District

***Rassylnaya V.Yu.***
*Education Establishment “Belarussian State Academy of Arts”, Minsk*

*The article centers round the study of the decorative features of homespun products from the Village of Vasilyevka, Dobrush District, Gomel Region in the 20th century. The village belongs to the ethnic and cultural region of the Dnieper River and is rich in various weaving traditions. The study focuses on the artistic features of homespun products from the author’s family collection, which includes various types of woven products: towels for the icon, dishcloths, tablecloths and bedspreads created from the beginning of the 20th century to the 1960s. The study reveals local features of the products, which are characterized by rhombic-geometric ornamentation, rhythmic alternation of stripes and the predominance of red-white-black color schemes. Special attention is paid to technological aspects: the use of linen and cotton threads, the combination of various weaves (plain, twill, two-weave multi-weave, woven, elective weaving and sorting weaving), the utilitarian and ceremonial purpose of the products is noted. Thus, the study demonstrates the richness and uniqueness of the weaving traditions of the Village of Vasilyevka, Dobrush District, which, despite all the historical trials of the 20th century, have preserved their artistic and cultural value, and contributes to the study of local variations of Belarusian textiles, emphasizing its role in the ethnocultural heritage of Belarus.*

***Key words:*** *Belarusian traditional weaving, decorative and applied arts, folk crafts, towel for the icon, Dobrush District, the Dnieper River region.*

*(Art and Cultur. — 2026. — № 1(61). — P. 12–17)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: vbahachova@gmail.com — В.Ю. Рассыльная*

Падняпроўе — рэгіён найбольш выразных і багатых мастацкіх традыцый абрадавых ручнікоў. Падняпроўскія ручнікі здзіўляюць сваёй каляровай насычанасцю, разнастайнасцю кампазіцыйных рашэнняў, шматлікасцю прыёмаў і спосабаў ткацтва, вышыўкі, карункапляцення. Тэкстыльныя традыцыі гэтага рэгіёна разглядалі М.М. Віннікава, В.А. Лабачэўская, Г.Р. Нячаева, М.Ф. Раманюк, Я.М. Сахута, І.Ю. Смірнова, В.Я. Фадзеева і іншыя навукоўцы. У фокус нашага даследавання ўваходзяць лакальныя варыяцыі традыцыі. Мэта дадзенага артыкула — выявіць мастацкія рысы даматканых вырабаў аўтарскай калекцыі з в. Васільеўка Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў кантэксце традыцый рэгіёна.

Канкрэтны факталагічны матэрыял, на які абапіраецца аўтар, належыць яго сям'і па бацькоўскай лініі. Прадстаўнікі сям'і Казловых з в. Васільеўка былі працавітыя і адораныя мастацкім густам людзі. Прабабка даследчыка Таццяна Іванаўна Казлова (1906–1994) ткала, прадзед Зіновій Арцямонавіч Казлоў (1904–1987) быў цесляром, стварaў драўляную мэблю для дома (куфары, сталы, шафы, услоны, зэдлікі), бабуля Ганна Зіноўеўна Казлова (1927–2015) і яе дзве сястры Лідзія Зіноўеўна Казлова (1935–2007) і Вольга Зіноўеўна Чарнавокая (1929–2016) шылі, вышывалі, вязалі шыдэлкам.

Традыцыі мастацкага ткацтва, на жаль, скончыліся на прабабцы, якая ткала да 1960-х гг. Ткала яна па-майстэрску, валодала шматлікімі тэхнікамі. Адкуль яна гэтаму навучылася — невядома, аднак у гэтай мясцовасці здаўна быў закладзены моцны рамесны падмурак — Добрушская палатняна-ткацкая мануфактура (1775–1831), Кузьмініцкая палатняная мануфактура (канец XVIII стагоддзя), дзе прыгонныя сяляне працавалі [1, с. 68] і знаёміліся з разнастайнымі прыёмамі ткацтва, а пасля перадавалі іх з пакалення ў пакаленне сваякам. На жаль, уменне выконваць узорыстыя тканыя вырабы не перайшло ад прабабулі яе дочкам. Пасля вайны з маладзейшага пакалення ткала адна Вольга Чарнавокая, якая працавала ў калгасе, і толькі простае палатно. Ці звязана гэта са звычайным нежаданнем дачок або з іх працай настаўніцай, фельчарам і ў зімовы перыяд (калі ў жыхароў сельскай мясцовасці нямнога менеі клопатаў і працы), застаецца тайнай, але з аб'ектыўных прычын паступовага заняпаду ткацтва ў гэтай мясцовасці трэба назваць недахоп матэрыялаў. Па словах Леаніда Мікалаевіча Чарнавокага 1950 г.н., ніткі для ткацтва ў 1950-я было дастаць цяжка, асабліва лён (ён вырошчваўся толькі ў калгасе), часам адну зіму пралі ніткі, а ў наступную ткалі адзін вялікі выраб. Ён дапамагаў снаваць аснову.

**Дэкаратыўнае рашэнне ручнікоў-набожнікаў.** Самымі старажытнымі артэфактамі ў калекцыі даследчыка з'яўляюцца тканыя *ручнікі-набожнікі* прабабулі Таццяны Іванаўны Казловай. Нам вядома, што яна была сіратой, мела брата і выхоўвалася мачахай. Аднак не захавалася інфармацыя, хто дакладна вырабіў гэтыя ручнікі. Калі іх ткала прабабуля (а ткала яна на даволі высокім узроўні), то ручнікі з'явіліся не раней 1920-х гг. Аднак М.М. Віннікава прытрымліваецца думкі, што гэтыя ручнікі магло зрабіць папярэдняе пакаленне на мяжы XIX–XX ст. (меркаванне аўтарытэтнага мастацтвазнаўцы заснавана на сведчаннях яе маці, народжанай у в. Усохская Буда Добрушскага раёна [2] у 16 км ад в. Васільеўка).

У час Вялікай Айчыннай вайны в. Васільеўка была спалена немцамі, сям'я Казловых хавалася ў суседняй в. Чырвоны Алёс і зараз невядома, якім цудам ацалелі старажытныя артэфакты нашага роду, зразумела толькі, што яны ўяўлялі сабой вялікую каштоўнасць. Магчыма, пашкоджанні ў перыяд ліхалецця абумовілі такое рознае тэхналагічна, па матэрыяле і яго шырыні спалучэнне канцоў ручнікоў з іх сярэднікамі, пра што пойдзе гаворка ніжэй.

Ручнікі гэтай зоны (табл.) дастаткова вузкія, але адзін з ручнікоў быў намерана абрэзаны ўздоўж да шырыні 20 см (мал. 1). Гэта магло быць выклікана як побытавымі прычынамі (зношанасць), так і зменай функцыянальнасці (удзел у пахавальных абрадах сустракаецца часта ў гэтым рэгіёне). Дадзены ручнік самы чысты, просты па сваім кампазіцыйным рашэнні. Арнамент чырвонага колеру канцэнтруецца толькі на канцах. Шэсць аднолькавых палос густога чырвонага арнамента (рамбічная сетка) у бранай тэхніцы чаргуюцца з пяцццю палосамі з чатырох аднолькавых 12-прамянёвых рамбічных разетак-"кветак" (назва з в. Дубраўка [3, с. 77]) выбарнага ткацтва. Уся кампазіцыя завершана знізу і зверху трыма тонкімі чырвонымі палоскамі-"пруточкамі". У аздабленні ручніка прысутнічаюць некаторыя тэхналагічныя памылкі (розная шырыня тонкіх палос, зрух разетак у адзін бок, неаднолькавая адлегласць паміж імі), што сведчыць аб хатняй вытворчасці ручніка.

Другі ручнік у брана-выбарнай тэхніцы (мал. 2) мае больш развітае аздабленне. Яго прышыты сярэднік вырашаны ў пульсуючую папярочную палоску: 2 чырвоныя палоскі па 2 пракідкі праз 3,5 см чыстага фона чаргуюцца з 2 пракідкамі па 3 ніткі. Больш развітыя

Табліца

**Асноўныя характарыстыкі тканых ручнікоў (в. Васільеўка, Добрушскі раён)**

| | Памер ручніка: даўжыня (з карунк.) хшырыня | Матэрыял фона | Тэхніка аздаблення | Аздабленне канцоў | Назвы арн. матываў у дубраўскай традыцыі | Сярэднік | Колер арнаментацыі | Карункі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 214 см (230 см)х20 (ручнік абрэзаны) | Бавоўна | Браная, выбарная | Чаргаванне 6 палос-бардзюраў з 5 палосамі з разеткамі-ромбамі (35 см) | Кветкі | Прышыты, без малюнку, лён | Чырвоны | Белыя, вязаныя шыдэлкам з бавоўны, зубчасты край, сеткава-рамбічная кампазіцыя (7,5 см) |
| 2 | 214 см (248 см)х24 см | Лён | Браная, выбарная | Чаргаванне 6 чырвоных палос-бардзюраў з 5 палосамі з разеткамі-ромбамі (41 см). Зверху паўтораны арнаментальны бардзюр | Любістак | Прышыты, у тонкую палоску, лён | Чырвоны | Белыя, вязаныя шыдэлкам, філейная сетка з кутасамі |
| 3 | 234 см (252 см)х27 см | Бавоўна | Выбарная, пераборная | Чаргаванне 4 палос дробных ромбаў з 3 палосамі асобных рамбічных разетак. Паміж імі — 2 тонкія палоскі колеру (48 см) | Качан / звязда | Прышыты, у вузкую чырвона-белую палоску, лён | Чырвоны, белы магчыма, быў чорны) | Фабрычныя сінтэтычныя |
| 4 | 98 см (116 см)х26,5 см | Бавоўна | Браная, выбарная, пераборная | Чаргаванне 4 вузкіх палос рамбічнага арнамента з шырокімі палосамі ў 3 рамбічныя разеткі (49,5 см) | Пампушкі, кветкі, крэсцікі, жучкі | Суцэльны, упрыгожаны двума відамі арнаментаваных чорна-чырвоных палос | Чырвоны, чорны | Белыя, вязаныя шыдэлкам, філейная сетка з рамбічным малюнкам і кутасы (20 см) |
| 5 | 210 см (240 см)х27,5 см (25 см сярэднік) | Бавоўна | Пераборная (слупок у 6 нітак), браная, выбарная | Буйная трохчастковая сіметрычная кветкавая кампазіцыя (59,5 см) | Дуб з яйкамі, качаны | Прышыты, арнаментаваны чырвонымі пракідкамі палатна і трохчастковай арнаментаванай паласой брані, бавоўна | Чырвоны, чорны | Белыя з чырвонай абвязкай, вязаныя шыдэлкам, філейная сетка з малюнкам хвалістай вінаграднай галінкі, зубчасты край (15 см) |
| 6 | 194 см (226 см)х28,5 см | Бавоўна | Пераборная (слупок у 6 нітак) | Трохчастковая кампазіцыя дыяганальнай рамбічнай сеткі (46 см) | — | Прышыты, з белай фабрычнай тканіны | Чырвоны | Белыя, вязаныя шыдэлкам, філейная сетка з касымі палоскамі, зубчасты край (15 см) |
| 7 | 208 см (232 см)х32 см | Лён | Пераборная (слупок у 5 нітак) | Двухгаловыя арлы (27 см) | Арлы, крэсцікі | Суцэльны ў палоску друх відаў | Чырвоны, чорны | Белыя, у выглядзе перавязаных зверху ў сетку кутасоў (12 см) |

тут і карункі: 6,5-сантыметровая філейная сетка з 3 відаў ромбаў завершана кутасамі, перавязанымі ў верхняй частцы вузламі ў рамбічную сетку. Чаргаванне шасці чырвоных прарэдджаных малюнкам (у 5,5 зорак-“любістакаў”) арнаментальных палос бранага ткацтва з пяццю палосамі па 5 чырвона-чорных 8-прамянёвых ромбаў утварае больш лёгкую кампазіцыю. Чырвоны і чорны колеры 8-прамянёвых ромбаў у палосах чаргуюцца ў “шахматным” парадку: 1) ч.-чырв.-ч.-чырв.-ч.; 2) чырв.-ч.-чырв.-ч.-чырв. Знізу арнаментальны канец ручніка завершаны дзвюма тонкімі палоскамі з выбраных слупкоў па тры ніткі. Зверху паміж такіх палос паўтораны арнаментальны бардзюр у бранай тэхніцы.

Трэці ручнік (мал. 3) мае яшчэ больш лёгкую арнаментацыю (пераважае белы фон). Сярэднік упрыгожаны 3-сантыметровымі “калодкамі”, якія паўтараюцца кожныя 11 см. “Калодка” складаецца з трайнога шэрагу бела-чырвоных выцягнутых па гарызанталі цаглінак, якія чаргуюцца ў “шахматным” парадку, паабапал іх — па 4 чырвоныя паласы слупочкаў. Колер “цаглінак” у кожнай паласе мяняе пазіцыю адносна ніжняй і верхняй: 1) чырвоная ў цэнтры — 2 белыя вышэй — чырвоная ў цэнтры; 2) белая ў цэнтры — 2 чырвоныя вышэй — белая ў цэнтры. Доўгія арнаментаваныя канцы вырашаны перамяжоўваннем 4 шырокіх бардзюраў з 3 палосамі разетак (па 5 штук) выбарнага ткацтва. Паласа-бардзюр уяўляе сабой дыяганальную сетку з трох шэрагаў дробных развітых разетак. Паміж палосамі і абапал арнаментальная кампазіцыі ідуць па дзве палоскі слупочкаў пераборнага ткацтва. Усё аздабленне канца зроблена чырвоным узорным утком. Разеткі ўяўляюць сабой сплюснутыя па вертыкалі ромбы з абрэзанымі вострымі канцамі, праменьчыкамі і вочкам унутры і ў цэлым нагадваюць узоры “качан” / ці “звязда” ў дадзеным рэгіёне [3, с. 76].

Сярод ручнікоў, выкананых пераважна ў браных тэхніках, захавалася адна палова цэльнага чорна-чырвонага ручніка з самым развітым аздабленнем (мал. 4). Сярэднік ручнікаператканы двума відамі арнаментаваных калодак у пераборнай тэхніцы: 1) “крэсцікі” (назва з в. Дубраўка [3, с. 77]) — паміж трайнымі чырвона-чорна-чырвонымі палосамі крыжападобныя сплюснутыя фігуры (чорная гарызантальная перамычка, чырвоны верх і ніз); 2) “жучкі” (назва з в. Усохская Буда [3, с. 75]) — паміж трайнымі чырвона-чорна-чырвонымі палосамі геаметрызаваная чырвоная кветка з чорнымі палоскамі і сарцавінай. Кампазіцыя канца ручніка ўяўляе сабой рытм з 4 вузкіх палос-бардзюраў-“пампушак” (назва з в. Дубраўка [3, с. 79]) і 3 шырокіх палос з 16-прамянёвымі ромбамі-“кветкамі”. Гэтыя палосы аддзелены адна ад адной, а таксама зверху і знізу трыма чорна-чырвона-чорнымі палоскамі пераборнага ткацтва. Чырвоныя разеткі-ромбы знаходзяцца ў своеасаблівых чорных рамах, што стварае ўражанне, нібыта сонейка заглядвае ў разное акно. Верхні і ніжні край чырвонай паласы-бардзюра заменены на чорны колер. Знізу ўсёй кампазіцыі аздобленага канца ручніка не хапае адной чырвонай палоскі перабору, зверху — дадатковая чырвоная паласа і лёгкія па шчыльнасці колеру чорна-чырвона-чорныя пракідкі палатна. Карункі гэтага ручніка больш доўгія, перавязка кутасоў даволі складаная. Павышанае аздабленне гэтага ручніка сведчыць аб яго асаблівым прызначэнні, якое засталося невядомым для нашчадкаў.

На іншых ручніках пераважае аздабленне пераборнай тэхнікай. Прышыты сярэднік толькі аднаго з іх (мал. 5) мае трайную чырвоную паласу ў брана-выбарна-пераборных тэхніках ля арнаментаванага канца ручніка з разеткамі-“качанамі” [3, с. 76]. Паміж дастаткова простымі рамбічнымі бардзюрамі брані ў абрамленні дзвюх палосак перабору знаходзіцца бардзюр з 6 дробных разетак. Далей сярэднікператыканы па чарзе трыма і адной чырвонымі пракідкамі палатна ў 2–3 ніткі (кожныя 3 см). Пераборны канец ручніка ўяўляе сабой адну вялікую кветкавую кампазіцыю (сіметрычную па гарызанталі і вертыкалі), якую ўмоўна можна падзяліць на тры часткі. У верхняй і ніжняй адлюстравана лісце, у цэнтры — буйная чатырохпялёсткавая кветка. Дадзеная кампазіцыя ў в. Дубраўка мае назву “дуб з яйкамі” [3, с. 75]. Зверху і знізу кветкавай кампазіцыі знаходзяцца вузкія бардзюры геаметрычнага характару. У аздабленні пераважае чырвоны колер, аднак прысутнічаюць і бела-шэрыя элементы, якія, верагодна, былі чорнымі і выцвілі з цягам часу. Амаль ідэнтычны ручнік ёсць у калекцыі Веткаўскага музея народнай творчасці, паходзіць ён з в. Чырвоная Буда Добрушскага раёна і быў выраблены ў 1879–1880-я гг. [3, с. 590].

Выцягнутая чырвоная кампазіцыя ручніка з чыстым прышытым сярэднікам (мал. 6) — трохчастковая, сярэдняя паласа ўтрая шырэйшая за ніжнюю і верхнюю, але арнаментацыя аднолькавая: дыяганальная сетка з ромбаў-крыжоў. Тры паласы аддзеленыя адна ад адной белым фонам і чырвонай паласой перабору. Ад сярэдніка арнаментацыя абмяжоўваецца трыма палосамі-пракідкамі палатна чырвоным утком.

Сярод разгледжаных ручнікоў вылучаецца характарам сваёй кампазіцыі апошні (мал. 7), вытканы па ільняной аснове. Кампазіцыя яго канца невысокая (вышыня трошкі меншая за вышыню), сіметрычная толькі па вертыкалі і складаецца з двух двухгаловых арлоў, якія стаяць на арнаментаванай паласе і шэрагу стылізаваных цэркавак. Сярэднік ручніка ператкасны палосамі двух відаў: 1) паміж строеных чырвона-чорна-чырвоных палосак шэраг чырвоных фігур накшталт "I" і чорных крыжыкаў (узор "крэсцікі", назва з в. Дубраўка [3, с. 77]); 2) чорна-чырвоныя стрэлкі на чорнай восі. Ручнік мае больш старажытнае афармленне ў выглядзе кутасоў, пераплеценых у нескладаную сетку. Унікальнасць матэрыяла, квадратнай формы кампазіцыі, кутасы могуць сведчыць ці аб незвычайнай функцыі ручніка, ці аб іншым часе яго вырабу, ці аб іншым аўтарстве (дастаўся ў падарунак ці быў набыты).

Ручнікі-набожнікі аўтарскай калекцыі пачатку XX ст. цалкам адпавядаюць асаблівасцям дэкаратыўнага афармлення тканін Падняпроўя [4, с. 9], адносяцца да другога тыпу кампазіцыі добрушскіх браных ручнікоў, разгледжаных В.А. Лабачэўскай [1, с. 103], але маюць больш шчыльную арнаментацыю. Пераборныя ручнікі супадаюць з добрушскай пераборнай традыцыяй [1, с. 111]. Г.Р. Нячаева звужае лакалізацыю і адносіць ручнікі дадзенай мясцовасці да дубраўскай традыцыі [3, с. 46].

Тэхнічна і браныя тэхнікі, і перабор з прыціскной асновай разлічваліся ў гэтых ручніках троечкамі: па 6 баваўняных нітак у слупку, прыступкі ў малюнку па 3 слупкі. Тканы ўзор дробны і шчыльны, вельмі развіты, што сведчыць аб вялікім майстэрстве. Аднак гэта не самыя тонкія прыклады мясцовай традыцыі. Добрушскія пераборныя ручнікі канца XIX ст. адрозніваюцца незвычайна пругкім рэльефам узора, які дасягаўся перакрыццём узорнай ніткай толькі 3 нітак асновы [5, с. 307].

**Афармленне ўтылітарных тэкстыльных вырабаў.** Ручнік-набожнік у вясковым жыллі выконваў пераважна дэкаратыўную функцыю, аднак большасць тканых вырабаў усё ж мела ўтылітарны характар. Гэта, найперш, ільняное палатно і *ручнікі-ўціркі* (мал. 8). У дадзенай мясцовасці для такіх вырабаў выкарыстоўваліся розныя віды перапляценняў: 1) палатнянае (43–48 см шырынёй, 12–13 нітак асновы на 1 см); 2) саржавае "елачкай" (35–44 см шырынёй, 10–11 нітак асновы на 1 см); 3) рамбавіднае саржавае (43–44 см, 13 нітак асновы на 1 см); 4) двухуточнае шматрамізнае. Вырабы рамбавіднага саржавага перапляцення адбелены, відаць, яны мелі большае рэпрэзентатыўнае значэнне ў гаспадарцы. Чатырохнітовым двухуточным перапляценнем шэрым па шэраму вытканы і адзіны ручнік (45 см, 14 нітак асновы на 1 см) (мал. 9). Яго клятчастая кампазіцыя складаецца з квадратаў у рамбічную сетку з кветак. Квадраты абламаваны ўдвая вузейшымі бардзюрамі ў палоску, перакрыжаванне якіх утварае квадрат.

Сярод тканых утылітарных вырабаў больш складана распрацоўваліся *абрусы* ў двухуточных шматрамізных тэхніках.

Першы абрус (87х143 см) (мал. 10) сшыты з дзвюх полак, месца шва закрыта паласой тканіны, аздобленай вышыўкай крыжыкам. Гэта самаробная стужка прышыта да абруса на машынцы, тады як сярэдняе шво і акуратны патайны падгін края зроблены ўручную. Стужка ўпрыгожана сіметрычнымі чырвонымі шасціпялёсткавымі кветкамі з шэрымі (раней чорнымі) сцяблінкай і лісточкамі. Кветкі нібыта вырастаюць адна з адной у адным напрамку. Асноўнае палатно выканана чатырохнітовым двухуточным перапляценнем малюнкам "у шашачкі", па кароткіх баках пракладзены тры чырвоныя паласы ў чорным абрамленні. Крыху ў аснове і значна больш ва ўтку сустракаюцца памылкі, няроўная шырыня палос.

Другі абрус (87х132 см) (мал. 11) таксама пашыты з дзвюх полак, але месца шва закрыта пакупной стужкай і ўсе швы, нават падгін края, выкананы на швейнай машынцы. Гэта сведчыць аб больш познім вырабе. Тэхніка і кампазіцыя абруса падобная да папярэдняга, але для асновы і фонавай ніткі абраны шэры лён, а для ўзорнага ўтка — белая бавоўна, што надае вырабу больш графічнае і святочнае гучанне. Складана распрацаваны і чырвона-чорныя палосы па кароткіх баках абруса: чорна-чырвона-чорная, чырвона-чорна-чырвоная, чорна-чырвона-чорная. Асноўнае поле выравашана буйнымі круглымі разеткамі і эфектам "дымкі", разеткі буйныя — па 2 на шырыню і па 8 на даўжыню полкі.

У пасляваенны час на Беларусі становіцца папулярным выраб тканых *посцілак*. Па сведчаннях Леаніда Мікалаевіча Чарнавокага ў іх сям'і посцілкі ткала прабабуля Таццяна. На фотаздымках 1970-х гг. мы сустракаем дзве дамотканыя посцілкі чатырохнітовым двухрамізным перапляценнем (мал. 12), аднак самую вялікую мастацкую каштоўнасць мела посцілка ў ружы, якой карысталася дачка майстрыхі Ганна да сваёй смерці ў 2015 г. Посцілка ў два сшытыя палотнішчы (мал. 13) была выткана пераборам "пад слупок" па чорнай льняной аснове рознакаляровым (яскравым ружовым, зялёным) ваўняным узорным утком.

Яе кампазіцыя складалася з 7 на 6 квадратаў з буйной ружай унутры кожнага.

**Заключэнне.** Такім чынам, у першай палове XX ст. аж да пачатку 1960-х гг. у в. Васільеўка Добрушскага раёна працягваўся выраб тканага палатна, ручнікоў, ручнікоў-набожнікаў, абрусаў і посцілак у дэкаратыўных і практычных мэтах. Вырабы адрознівае досыць высокае тэхналагічнае выкананне, аднак некаторыя памылкі ў размяшчэнні малюнка, вольнае абыходжанне з палатном ручніка (абрэзванне, дашыванне розных сярэднікаў) сведчыць аб іх хатняй вытворчасці. У якасці матэрыялу лён выкарыстоўваўся пераважна для ўтылітарных прадметаў, а бавоўна — для дэкаратыўных, сустракалася спалучэнне розных па паходжанні валокнаў у адным вырабе (лён + бавоўна, лён + воўна). У дэкаратыўным афармленні пераважалі сіметрычныя кампазіцыі, вялікую ролю гралі рытм і чаргаванне палос двух відаў. Колер фонавага палатна ахраматычны — белы, шэры, чорны. Колер узора змяняецца ад чырвонага з невялікім дадаткам чорнага ў ручніках і абрусах да шматколернасці ў посцілках. Частым з’яўляецца прыём чаргавання колеру ў “шахматным” парадку. Ромба-геаметрычная арнаментацыя па сваіх назвах мае цесную сувязь з прыродай (расліны, птушкі, казюркі) і вобразам крыжа. Дэкаратыўнае афармленне ручнікоў адпавядае вылучаным раней даследчыкамі зонам Падняпроўя, гомельска-добрушскай і дубраўскай традыцыям, аднак мае свае мясцовыя асаблівасці. Аналіз такіх лакальных праяў народнай культуры запаўняе існуючыя лакуны ў беларускім мастацтвазнаўстве і этнаграфіі, спрыяе стварэнню комплекснага ўяўлення пра багацце і ўнікальнасць беларускай народнай культуры, а таксама закладвае падмурак для яе рэнавацыі ў сучасным мастацкім полі.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Лабачэўская, В. Повязь часоў — беларускі ручнік / В. Лабачэўская. — Мн.: Беларусь, 2002. — 232 с.
2. Віннікава, М.М. Традыцыйнае жаночае адзенне сяла Усохская Буда Добрушскага раёна Гомельскай вобласці / М.М. Віннікава // Этнаграфія беларускага Падняпроўя: матэрыялы навук. канф., Магілёў, 30 лістап. — 1 сн. 1999 г. / Магілёўс. абл. краязн. музей; пад рэд. Л.А. Сугака. — Магілёў, 1999. — С. 107–111.
3. Арнаменты Падняпроўя / аўт. тэксту Г.Р. Нячаева [і інш.]; навук. рэд. Я.М. Сахута; фота А.В. Чыжова, Г.Р. Нячаевай. — Мн.: Бел. навука, 2004. — 606 с.
4. Винникова, М.Н. Народное узорное ткачество Беларуси конца XIX — начала XX века: автореф. дис. … канд. искусствоведения: 17.00.04 / Винникова Мария Николаевна; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы Нац. акад. наук Беларуси. — Мн., 2001. — 16 с.
5. Фадзеева, В. Беларускі ручнік / В. Фадзеева. — Мн.: Полымя, 1994. — 322 с.


*Пастypiў у рэдакцыю 14.07.2025*